Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 25 (267) | Панядзелак, 1 кастрычніка 1956 года | Цана 20 кап.

# ПА УНІВЕРСІТЭТУ

* * *

## *Усё тут падрыхтавана да заняткаў*

Студэнты гістарычнага і юрыдычнага факультэтаў ахвотна наведваюць кабінет марксізма-ленінізма і палітэканоміі. Хораша і утульна там: дабротныя выгодныя сталы, прыгожыя дываны на падлозе, стэнды і наглядныя дапаможнікі—усё гэта стварае добрыя абставіны для заняткаў.

— Да новага навучальнага года мы падрыхтавалі многа новага,— гаворыць Р. З. Ханіна—старшы лабарант кабінета.

— У кабінеце аформлены стэнды, вітрына па шостаму пяцігадоваму плану. На відным месцы вывешана тэматыка для дыпломных работ.

У адпаведнасці з праектам новаи праграмы па гісторыі КПСС, філасофіі і палітэканоміі састаўлена картатэка з указаннем літаратуры па кожнай тэме.

Сярод новай літаратуры асабліва каштоўнымі з'яўляюцца кнігі успамін аб жыцці і дзейнасці В. І. Леніна.

А. АЛЕШКА.



НА ЗДЫМКУ: Студэнткі I курса хімічнага факультэта Валя Астапека, Валя Кукашынава і Мая Баркоўская на першых лабараторных занятках.

Фото М. Пільшчыкава.

## ТАВАРЫСЦКІЯ СУСТРЭЧЫ

Ціха і спакойна зараз у аудыторыях універсітэта. Больш палавіны студэнтаў працуюць на калгасных палях.

А у спартыўнай зале БДУ з самага рання і да позняга вечара праходзяць трэніроўкі. Да новых сустрэч рыхтуюцца баскетбалісты і гімнасты. Легкаатлеты і лыжнікі трэніруюцца на стадыёне.

Рэгулярна праходзяць трэніроўкі валейбольнай секцыі (трэнер майстар спорту Ефімаў). З кожным днём калектыў валейбалістаў становіцца больш дружным, зладжаным. Спартсмены павышаюць сваё майстэрства.

22-га верасня адбылася таварысцкая сустрэча па валейболу паміж мужчынскімі камандамі універсітэта і інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Ігра праходзіла пры яўнай перавазе валейбалістаў БДУ і закончылася іх перамогай з агульным лікам 3:1.

А днём пазней адбыліся таварысцкія сустрэчы баскетбольных мужчынскіх і жаночых каманд БДУ і медыцынскага інстытута. Ігра праходзіла з пераменным поспехам. Перамога—за спартсменамі універсітэта. Жаночая каманда БДУ выйграла з лікам 36:33, мужчынская—з лікам 56:47.

А. ПУСТАХОД.



На 5-ым курсе хімічнага факультэта ідуць заняткі. Кожны дзень шматлікія лабараторыі факультэта запаўняюць выпускнікі. Зараз у іх адказны перыяд. Пяцікурснікі абмяркоўваюць тэмы дыпломных работ.

Студэнтка групы арганічнага сінтэзу Тамара Шут гаворыць:

— У нашай групе сем чалавек. Цяпер у нас практычныя заняткі па арганічнаму сінтэзу. Усе мы абралі тэмы дыпломных работ. Мне, напрыклад, прыдзецца мець справу з трыфторуксуснай кіслатой.

Многія выпускнікі збіраюць матэрыялы для сваіх дыпломных работ ужо даўно. З трэцяга курса пачала працаваць над пытаннем хроматаграфіі смол Тамара Галышава. Яе кіраўнік—дацэнт К. А. Пячорская. Пад кіраўніцтвам Ф. Г. Асіпенка над тэмай «Хроматаграфія углевадародаў» працуе выпускніца Ольга Шырокая.

НА ЗДЫМКУ: Студэнткі 5-га курса Рая Сеўба і Тамара Шут у лабараторыі.

Фото Э. Дамарацкага і П. Беражкова

## ЗА КАРЭННАЕ ПАЛЯПШЭННЕ ВЫКЛАДАННЯ ГРАМАДСКІХ НАВУК

XX з'езд КПСС, які з'явіўся буйнейшай гістарычнай падзеяй у жыцці нашай партыі і краіны, у жыцці міжнароднага комуністычнага руху, даў совецкаму народу чоткую праграму барацьбы за далейшы уздым усёй эканомікі і культуры краіны. Паспяховае ажыццяўленне вялікіх задач комуністычнага будаўніцтва, пастаўленых з'ездам, настойліва патрабуе далейшага павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Вялікае значэнне у гэтай справе заклікана адыграць творчае засваенне студэнтамі марксізма-ленінізма—навукі аб законах развіцця чалавечага грамадства, аб законах будаўніцтва комунізма.

У рашэннях і матэрыялах XX з'езда ускрыты і падвергнуты сур'ёзнай крытыцы памылкі і недахопы, якія мелі месца у навуковай распрацоўцы праблем палітычнай эканоміі, філасофіі, гісторыі КПСС, юрыдычнай навукі, так і выкладанні грамадскіх дысцыплін у вышэйшай школе, у вывучэнні марксізма-ленінізма нашымі кадрамі. Важнейшы з недахопаў нашай ідэалагічнай работы, нашага тэарэтычнага фронту састаіць у адрыве тэарэтычнай работы, прапагандысцкай работы ад жыцця, ад практыкі комуністычнага будаўніцтва. Шырокае распаўсюджанне атрымалі такія адмоўныя з'явы, як дагматызм, цытатніцтва, начотніцтва, калі вышэйшым крытэрыем правільнасці той ці іншай тэорыі, таго ці іншага палажэння у грамадскай навуцы лічылася не жыццё, не практыка комуністычнага будаўніцтва, а наяўнасць выказвання, цытаты таго ці іншага аўтарытэта. Сур'ёзным тормазам на шляху развіцця грамадскай навукі з'ўляецца культ асобы, пры якім лічылася, што выказваць нешта новае і арыгінальнае у грамадскай навуцы можа толькі адзін І. В. Сталін, а усе астатнія павінны толькі папулярызаваць і пераказваць яго думкі. Гэта немінуча вяло да дагматызму, да таго, што часта жыццё падганялася пад цытату, нярэдка прыводзіла да таптання на месцы у грамадскай навуцы.

У галіне прапагандысцкай і выкладчыцкай работы дагматызм і начотніцтва праявіліся у тым, што вывучэнне марксісцкай тэорыі вялося адарвана ад задач гаспадарчага будаўніцтва, ад практыкі барацьбы совецкага народа за комунізм. Слаба увязвалася вывучэнне марксісцка-ленінскай тэорыі з практыкай, задачамі нашага будаўніцтва і у вышэйшай школе. Такое вывучэнне нярэдка прыводзіла да таго, што студэнты не вучыліся прымяняць тэорыю на практыцы, а проста завучвалі асобныя палажэнні, якія не маглі прымяняць да канкрэтнага аналізу сапраўднасці.

Можна было-б прывесці нямала прыкладаў, якія паказваюць, што такія недахопы мелі месца і у нашым універсітэце. Так, студэнт 5-га курса аддзялення журналістыкі В. Хорсун, здаваўшы дзяржаўны экзамен па асновах марксізма-ленінізма у ліпені гэтага году на пытанне аб крытыцы і самакрытыцы даволі бойка адказаў, што «крытыка і самакрытыка—гэта рухаючая сіла развіцця совецкага грамадства». Але ён аказаўся зусім бездапаможным, калі яго папрасілі растлумачыць, што гэта значыць, расказаць, як ён, будучы журналіст, будзе выкарыстоўваць гэтую рухаючую сілу у сваёй працы.

(Працяг на 3 стар.)

## АБ НОВЫМ ПАРАДКУ НАЗНАЧЭННЯ СТЫПЕНДЫЙ СТУДЭНТАМ

З першага верасня г. г. устаноўлены новы парадак назначэння стыпендый студэнтам ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Студэнтам першага курса стыпендыі у першым семестры назначаюцца:

прынятым у ВНУ без прыёмных экзаменаў з ліку закончыўшых сярэднюю школу з залатым або срэбраным медалем;

прынятым у ВНУ без прыёмных экзаменаў з ліку закончыўшых сярэднія спецыяльныя навучальныя установы з выдатнымі адзнакамі, уключаных у 5 працэнтаў выпуску спецыяльнай навучальнай установы;

прынятым у ВНУ без прыёмных экзаменаў удзельнікам Айчыннай вайны, закончыўшым сярэднюю школу з атэстатам выдатніка (незалежна ад году заканчэння школы);

здаўшым прыёмныя экзамены па ўсіх прадметах з адзнакай «выдатна» і «добра» і ў асобных выпадках атрымаўшым на уступных экзаменах «здавальняюча».

У наступных семестрах стыпендыі назначаюцца з першага дня таго месяца, які ідзе за экзаменацыйнай сесіяй пры ўмове выканання вучэбнага плану семестра. Адзнакі экзаменацыйнай сесіі павінны быць «выдатна» і «добра», а ў асобных выпадках «здавальняюча». Адзнакі па факультацыўным дысцыплінам пры назначэнні стыпендый не ўлічваюцца. Адзнакі па вучэбнай ці вытворчай практыцы ўлічваюцца нараўне з адзнакамі па залікам, для якіх устаноўлены дыферэнцыраваныя адзнакі.

Пры прадстаўленні студэнту водпуску стыпендыя за час водпуску не выплачваецца.

Студэнтам, пакінутым на паўторны год навучання па непаспяховасці, стыпендыя не выплачваецца на працягу ўсяго паўторнага года навучання.

Студэнтам, не атрымаўшым стыпендыю, пакінутым на другі год навучання па хваробе, стыпендыя можа быць назначана на паўторным годзе навучання па выніках чарговай экзаменацыйнай сесіі на агульных падставах.

Пры пераводзе са старэйшага на малодшы курс па асабістай просьбе студэнта, стыпендыя не выплачваецца увесь навучальны год.

Для назначэння стыпендый ствараюцца камісіі на факультэтах пад старшынствам дэкана або яго намесніка з удзелам грамадскіх арганізацый. Рашэнні стыпендыяльных камісій факультэтаў аб назначэнні студэнтам стыпендый зацвярджаюцца загадам рэктара.

Стыпендыяльныя камісіі пры разглядзе заяў студэнтаў аб назначэнні ім стыпендыі павінны ўлічваць паспяховасць і матэрыяльнае становішча студэнтаў (наяўнасць членаў сям'і і іх агульны заработак).

Стыпендыі незалежна ад матэрыяльнага становішча пры наяўнасці адзнак не ніжэй «здавальняюча» атрымліваюць:

Героі Совецкага Саюза і Героі Соцыялістычнай Працы;

былыя выхаванцы дзіцячых дамоў і дзіцячых працоўных выхаваўчых калоній і дзеці, якія знаходзяцца на патранаце;

глуханямыя і сляпыя.

Студэнты ВНУ, якія атрымліваюць пенсію з выпадку страты кармільца, з ліку рабочых і служачых назначаюцца на стыпендыю на агульных падставах.

Рэктар БДУ мае права часова знімаць са стыпендыі студэнтаў, якія парушаюць дысцыпліну.

Новы парадак назначэння стыпендый уступае у сілу з 1-га верасня 1956 года для першых курсаў і з 1-га лютага для другіх і старэйшых курсаў.

